# Дапаможнік



## для грамадзян Беларусі, якія хочуць выехаць у Польшчу

Stowarzyszenie
Interwencji
Prawnej



Дапаможнік прадстаўляе актуальны прававы статус на 22 верасня 2020 г. Зараз сітуацыя ў Беларусі вельмі дынамічная, і польскі ўрад задэкдараваў спрашчэнне ўезду, дапамогу з жыхарствам і доступам да рынку працы для грамадзян Беларусі. Актуальную прававую сітуацыю перад прыездам у Польшчу вы можаце атрымаць на старонках, размешчаных у канцы гэтага інфарматара, на старонцы Асацыяцыі юрыдычнай інтэрвенцыі (Stowarzyszenie Interwencji Prawnej), старонках адпаведных ведамстваў.

Stowarzyszenie
Interwencji
Prawnej

www.interwencjaprawna.pl
FB Stowarzyszenie Interwencji Prawnej

**1. Уезд у Польшчу на падставе візы**

Падчас трывання стану эпідэміі ў Польшчы грамадзяне Беларусі могуць заехаць на падставе кожнай візы ці карты пражывання.

Пасля перасячэння польскай мяжы Вас адправяць у хатнюю ізаляцыю – на каранцін. З 2 верасня каранцін доўжыцца 10 дзён. Агульны час ізаляцыіі будзе залежаць ад Вашага здароўя і рашэння ўрача -тэрапеўта.

Аб асобах, вызваленых з абавязковага каранціну пасля перасячэння знешняй мяжы ЕС, чытайце падрабязна на старонцы:
www.strazgraniczna.pl/pl/cudzoziemcy/covid-epidemia-koronawi

Вы абавязаны прайсці каранцін, таму пры ўездзе ў Польшчу неабходна загрузіць і ўсталяваць дадатак «Kwarantanna domowa» («Хатні каранцін»). Ён будзе кантраляваць, ці выконваеце вы каранцін, але таксама дасць магчымасць базавай ацэнкі здароўя, магчымасць непасрэднага звароту да мясцовага цэнтра сацыяльнай дапамогі, які можа дастаўляць лекі ці прадукты.

Вы вытрымліваеце каранцін па месцу жыхарства альбо часовага знаходжання. Калі ў Вас няма такога месца, санітарна-эпідэміялагічныя службы накіруюць вас у прызначанае месца на ізаляцыю. Ваша знаходжанне там будзе бясплатным.

**Больш падрабязна пра каранцін на старонцы:**
https://pacjent.gov.pl/aktualnosc/krotsza-kwarantanna
альбо на інфалініі для пацыентаў: +48 800 190 590, якая працуе таксама на рускай і англійскай мовах.

**а) Дзе я магу атрымаць візу?**

У Мінску:
**вул. Крапоткіна 91А**
**220002, г.Мінск**
**тэл. +375 17 388 52 31**
**факс: +375 17 388 52 38**
**minsk.wk.sekretariat@msz.gov.pl**

**Консульская акруга Консула Рэспублікі Польшча ў Мінску ахоплівае Мінскую, Гомельскую, Магілёўскую і Віцебскую вобласці.**

**Дзяжурны тэлефон:**
У надзвычайных абставінах, якія патрабуюць тэрміновага ўмяшання консула, можна звязацца па номеру тэлефона: +375 29 670 33 74 альбо праз e-mail: minsk.wk.dyzurny@msz.gov.pl

Гэты тэлефон і электронная пошта выкарыстоўваюцца **толькі для кантактаў** з дзяжурным консулам у **надзвычайных і выпадковых сітуацыях**, якія патрабуюць тэрміновай консульскай дапамогі ў непрацоўны час. Інфармацыя па візавых пытаннях і Карце паляка **не прадстаўляецца** па дзяжурным тэлефоне.

Інфармацыю па візавых пытаннях можна атрымаць па тэлефоне: +375 17 388 52 49

У Брэсце:
**вул. Куйбышава 34**
**224016, г.Брэст**
**тэл. +375 162 27 00 00**
**факс: +375 162 20 38 29**
**brzesc.kg.konsul@msz.gov.pl**

**Дзяжурны тэлефон:**
У надзвычайных сітуацыях, якія патрабуюць тэрміновага ўмяшання консула, можна звязацца з намі па электроннай пошце e-mail brzesc.kg.dyzurny@msz.gov.pl, тэл. +375 292 00 94 00.

**Гэты тэлефон і электронная пошта выкарыстоўваюцца толькі** для кантактаў з дзяжурным консулам у надзвычайных і выпадковых сітуацыях, якія патрабуюць тэрміновай консульскай дапамогі ў непрацоўны час. Перапіска, звязаная з іншымі пытаннямі, адпраўленымі на гэты адрас, не разглядаецца.

У Гродне:
**вул. Будзённага 48А**
**230023, г.Гродна**
**тэл. +375 152 73 10 00**
**факс: +375 152 73 10 22**
**grodno.kg.sekretariat@msz.gov.pl**

візавая інфармацыя тэл. +375 152 73 10 49
інфармацыя па Карце Паляка (ад 9.00 да 11.00)
тэл. +375 152 73 10 33
факс: +375 152 73 10 22
e-mail: для візавых пытанняў grodno.kg.wiza@msz.gov.pl
e-mail: для Карты Паляка grodno.kg.kartapolaka@msz.gov.pl
e-mail: для юрыдычных і грамадзянкіх пытанняў grodno.kg.prawne@msz.gov.pl

**Дзяжурны тэлефон:**
У надзвычайных сітуацыях, якія патрабуюць тэрміновага ўмяшання консула, можна звязацца з намі па тэлефоне: +375 33 311 77 70 альбо па электроннай пошце: grodno.kg.dyzurny@msz.gov.pl

Калі ў вас ёсць дакументы, якія дазваляюць Вам працаваць альбо пачаць вучобу на ВНУ ці іншай навучальнай ўстанове ў Польшчы, альбо Вы з’яўляецеся ўладальнікам Карты Паляка, Вам трэба падаць заяўку на візу згодна з мэтай уезду паводле

звычайнай працэдуры.

**Важна! Калі вы грамадзянін/грамадзянка Беларусі і знаходзіцеся ў Беларусі, і ў сувязі з сітуацыяй, якая зараз склалася ў краіне, хочаце атрымаць візу, якая дае права ўехаць у Польшчу з гуманітарнымі мэтамі, вы павіны зрабіць наступнае:**

Звяжыцеся з адным з консульстваў Польшчы ў Беларусі па тэлефоне альбо электроннай пошце:

- Консульскі аддзел Пасольства Рэспублікі Польшча ў Мінску – тэлефон: +375 17 388 52 49, адрас электроннай пошты: minsk.wk.wizy@msz.gov.pl, альбо
- Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Брэсце – тэлефон: +375 162 27 00 49, адрас электроннай пошты: visabrest@msz.gov.pl, альбо
- Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Гродне – тэлефон: +375 152 73 10 49, адрас электроннай пошты: grodno.kg.wiza@msz.gov.pl

У консульстве вам паведамяць куды падаць дакументы на візу. Неабходную інфармацыю можна таксама атрымаць у любым візавым цэнтры: www.vfsglobal.com/poland/belarus/

Візавую анкета можна падаць непасрэдна ў консульстве ці адным з візавых цэнтраў у Беларусі. Візавую анкету таксама можна падаць карэспандэнцыйна (адправіўшы яе па пошце на пададзены вам адрас).

**б) Колькі каштуе гуманітарная віза?**

Віза выдаецца бясплатна. Калі будзеце падаваць дакументы ў візавым цэнтры, то за паслугу прыёму дакументаў вы заплаціце 11 еўра.

**в) Якія дакументы мне трэба падаць для атрымання візы?**

Пры падачы заявы на візу неабходна прадставіць: запоўненую і падпісаную візавую анкету з фотаздымкам, сапраўдны пашпарт, выдадзены на працягу апошніх 10 гадоў, які мае не менш за дзве пустыя старонкі, і тэрмін яго дзеяння заканчваецца не раней чым праз 3 месяцы пасля заканчэння тэрміну дзеяння візы, медыцынскую страхоўку на перыяд, на які вы хочаце атрымаць візу, і пісьмовую заяву аб жаданні атрымаць візу ў Польшчу. Пры падачы дакументаў вы атрымаеце інфармацыю пра тое, калі і як можна забраць пашпарт.

**г) Як доўга я буду чакаць выданне візы?**

Пасля падачы заявы консульства разгледзіць яе як мага хутчэй. Калі рашэнне консула будзе станоўчым, вы атрымаеце нацыянальную візу (гуманітарныя мэты) тэрмінам максімум да 1 года.

**Больш падрабязнай інфармацыі на старонцы:**
www.gov.pl/web/bialorus/ambasada-rp-w-minsku

**д) Пасля прыезду ў Польшчу на падставе гуманітарнай візы я змагу працаваць, атрымліваць сацыяльную дапамогу/ медыцынскую дапамогу/ сацыяльнае жыллё?**

Сёння гуманітарная віза не дае права на працу, не дае права на сацыяльную і медыцынскую дапамогу ці права падаваць заяву на атрыманне сацыяльнага жылля.

**е) Ці змагу я ў любы час вярнуцца ў Беларусь?**

Так, зможаце вярнуцца ў Беларусь у любы час.

**Важна! Калі вы грамадзянін/грамадзянка Беларусі і знаходзіцеся ва Украіне, і ў сувязі з сітуацыяй, якая склалася ў краіне вашага грамадзянства, хочаце атрымаць візу, якая дае права ўехаць у Польшчу з гуманітарнымі мэтамі, вы павіны зрабіць наступнае:**

Звяжыцеся з адным з консульстваў Польшчы ва Украіне па тэлефоне альбо па электроннай пошце. Консульства знаходзіцца ў Кіеве, Львове, Луцку, Вінніцы, Адэсе і Харкаве, больш падрабязнасцей на сайце: www.gov.pl/web/ukraina/jak-umowic-sie-na-spotkanie-w-konsulacie).

У консульстве вам паведамяць, куды падаць дакументы на візу. Неабходную інфармацыю можна таксама атрымаць у любым візавым цэнтры: www.vfsglobal.com/Poland/Ukraine/).

**Больш падрабязнай інфармацыі па спасылцы:**
www.gov.pl/web/ukraina/informacja-na-temat-zasad-ubiegania-sie-o-wizy-przez-obywateli-bialorusi-

## 2. Прашэнне аб міжнароднай ахове

### Як падаць заяву на міжнародную ахову?

- **пры ўездзе на тэрыторыю Рэспублікі Польшча падчас памежнага кантролю (пры праверцы дакументаў вы павінны паведаміць супрацоўніку Памежнай службы, што хочаце атрымаць міжнародную ахову),**
- падчас знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча (вы павінны звярнуцца ў любое аддзяленне Памежнай службы і паведаміць супрацоўніку Памежнай службы, што хочаце атрымаць міжнародную ахову),
- праз камендаанта рэгіянальнага аддзелу ці камендаанта памежнага пераходу, якому падлягае тэрытарыя закрытага міграцыйнага цэнтра для замежнікаў, ізалятара для замежнікаў, ізалятара часовага ўтрымання альбо вязніцы – у тым выпадку, калі вы знаходзіцеся ў вышэйзгаданых месцах ўтрымання.

**Больш падрабязнай інфармацыі на старонцы:**
www.udsc.gov.pl/uchodzcy-2/uchodzcy/

### Што мяне чакае пасля падачы заявы аб міжнароднай ахове?

Вы павінны быць гатовыя да:

- сфатаграфавання твару (абавязкова),
- узяцця адбіткаў пальцаў (абавязкова для асоб старэйшых за 14 гадоў),
- правядзення медыцынскага агляду і санітарных працэдур,
- дэталёвай праверцы вашай асобы (толькі ў выпадках, абгрунтаваных бяспекай публічнага парадку),

**індывідуальнай размовы з супрацоўнікам Памежнай службы наконт абставінаў выезду з краіны паходжання** і інфармацыі, неабходнай для вызначэння, якая краіна будзе адказваць за разгляданне заявы аб міжнароднай ахове (ці ёсць у вас віза або карта пражывання ў краіне ЕС, ці вы пражывалі / прасілі ахову ў у якой-небудзь краіне ЕС, ці вас ёсць члены сям'і ў якой-небудзь краіне ЕС)

**Важна!** Будзьце гатовыя, што усе вышэйпералічаныя дзеянні займуць некалькі гадзін, а можа нават цэлы дзень.

**в) Як выглядае заява аб міжнароднай ахове на практыцы?**

Калі ў вас няма візы ці іншага дакумента, які дазваляе перасекчы мяжу, і вы адчуваеце абгрунтаваны страх, што ў Беларусі ваша жыццё знаходзіцца пад пагрозай, і вы не можаце разлічваць на абарону ўладаў вашай краіны, вы можаце звярнуцца за **міжнароднай аховай (статус бежанца).**

Пры перасячэнні мяжы вы павінны паведаміць пра гэта польскай Памежнай службе (далей: П.с.), што вы хочаце падаць заяву аб міжнароднай ахове (аб прадастаўленні вам статуса бежанца). Такая просьба павінна быць зроблена вусна падчас памежнага кантролю, калі супрацоўнікі правяраюць дакументы, якія дазваляюць на ўезд. Вы можаце прасіць ахову на любой мове, выкарыстоўваючы такія словы, як «прытулак», «міжнародная ахова», «статус бежанца» і – на гэтым этапе – толькі коратка дадаўшы, што ёсць пагроза вашай бяспецы і жыццю ў вашай краіне. У адпаведнасці з польскім і міжнародным заканадаўствам у такой сітуацыі – нават калі ў вас няма дакументаў, якія дазваляюць перасекчы мяжу, – П.с. абавязана ўпусціць вас і правесці ў асобнае памяшканне, якое забяспечвае канфідэнцыяльнасць размовы, і там прыняць вашу заяву аб міжнароднай ахове. Гэта будзе заключацца ў правядзенні вышэйзгаданых дзеянняў, у тым ліку ў запаўненні памежнай службы вычарпальнай, прыблізна 20-старонкавай анкеты, у якой супрацоўнік П.с. запіша вашыя адказы на зададзеныя ім пытанні. Пытанні будуць датычыцца вашых асабістых дадзеных, сям'і, адраса пражывання, апошняй працы, здзейсненых вамі паездак і г.д. Самымі важнымі будуць пытанні аб вашай індывідуальнай сітуацыі ў Беларусі – пра пераслед ці страх перад пераследам – аб прычынах, якія прымусілі вас звярнуцца за міжнароднай аховай, а таксама страхах і пагрозах, звязаных з магчымым вяртаннем у Беларусь. У гэтай частцы анкеты таксама будуць пытанні пра тое, ці падвяргаліся вы псіхічнаму ці фізічнаму гвалту, у тым ліку сэксуальнаму гвалту. Вельмі важна, каб вы адказалі на ўсе пытанні праўдзіва і поўна. Калі вы знаходзіцеся ў дрэнным псіхічным стане альбо па якой-небудзь іншай прычыне вам важка распавядаць пра дэталі сваёй гісторыі на гэты момант, скажыце пра гэта памежніку і вылучыце толькі найбольш важныя рэчы, дадаўшы, што вы раскажаце пра ўсе дэталі падчас статуснага сумоўя, якое адбудзецца з кіраўніком Упраўлення па справах замежнікаў праз некалькі тыдняў/ месяцаў. Пераканайцеся, каб гэта было запісана. Калі памежнік паведаміць вам, што месца, адведзенае ў форме для апісання прычын вашага страху перад пераследам, вычарпана, вы можаце папрасіць паперу і асадку і напісаць дадатковыя паясненні .

Перш чым падпісаць анкету, запоўненую супрацоўнікам памежнай службы, пераканайцеся, што ў дакуменце запісана менавіта тое, што вы хацелі сказаць. Памежная служба мае абавязак размаўляць з вамі падчас гэтага працэсу на мове, якую вы разумееце, альбо зарганізаваць перакладчыка. Пратакол будзе напісаны на польскай мове, але ён павінен быць прачытаны ўслых на зразумелай вам мове, бо вы маеце права патрабаваць гэта.

Каб звярнуцца за міжнароднай аховай пры ўездзе ў Польшчу не абавязкова мець месца і адрас, дзе будзеце знаходзіцца. Вы будзеце мець права жыць у цэнтры для бежанцаў на працягу ўсяго працэсу прызнання міжнароднай аховы.

Пасля падачы заявы на мяжы, вы павінны самастойна трапіць у прыёмны цэнтр у Белай Падлясцы, якім заведуе кіраўнік Упраўлення па справах замежнікаў (падрабязнасці гл. ніжэй), каб на працягу 2 дзён ад падачы заявы зарэгістравацца ў сістэме сацыяльнай і медыцынскай дапамогі.

Калі вы не хочаце (альбо не хочаце адразу) карыстацца сацыяльнай дапамогай Упраўлення па справах замежнікаў, пры падачы заявы вы павінны пакінуць адрас, па якім вы будзеце пражываць. Гэта вельмі важна, таму што кіраўнік Упраўлення па справах замежнікаў павінен мець адрас, на які ён будзе накіроўваць карэспандэнцыю адносна вашай працэдуры прызнання міжнароднай аховы.

**Памятай:** Памежная служба не мае паўнамоцтваў на прызнанне ці адмову міжнароднай аховы, памежнікі толькі прымаюць вашу заяву. Іх задача запоўніць анкету заявы на прадстаўленне міжнароднай аховы на падставе вашых адказаў і адправіць яе на разгляд кіраўніку Упраўлення па справах замежнікаў, а таксама ўпусціць вас у Польшчу, дзе вы маеце права і абавязак знаходзіцца на працягу ўсёй працэдуры атрымання міжнароднай аховы.

**Важна!** Аднак падчас памежнага кантролю польскія памежнікі часта робяць выгляд, што не чуюць/ не разумеюць, што хтосьці просіць міжнародную ахову, і замест таго, каб прыняць заяву, выдаюць рашэнне аб адмове ва ўездзе асобам, якія не маюць дакументаў (часцей за ўсё візы) на ўезд. Гэта парушэнне заканадаўства, але досвед паказвае, што гэта на жаль, здараецца. У гэтай сітуацыі неабходна звязацца з офісам Вярхоўнага Камісара ААН па справах бежанцаў у Варшаве (УВКБ), офісам Упаўнаважанага па правам чалавека ці адной з неўрадавых арганізацый, якая займаецца юрыдычнай дапамогай (усе кантактныя дадзеныя ў канцы дапаможніка).

**Толькі мяне пераследавалі/ толькі я пад пагрозай пераследу ў краіне майго паходжання. Ці магу я забраць з сабой у Польшчу жонку/ мужа і дзяцей?**

Так. Нават калі толькі адзін член сям'і знаходзіцца пад пагрозай пераследу, ён можа ўехаць у Польшчу з самымі блізкімі членамі сям'і. Памятайце, што трэба падаць сумесную заяву аб міжнароднай ахове. Тады ваша рашэнне, якое атрымаеце, ахопіць таксама вашу жонку/вашага мужа і дзяцей, гарантуючы ім тую самую форму аховы.

**Калі я змагу атрымаць статус бежанца?**

Замежнік атрымлівае статус бежанца, калі можа даказаць і абгрунтаваць асабістую пагрозу пераследу ў краіне па наступных прычынах:

- 1. расы,
- 2. рэлігіі,
- 3. нацыянальнасці,
- 4. палітычных перакананняў
- 5. прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы

не можа ці не хоча атрымаць аховы ў сваёй краіне.

Памятайце, што падчас трывання працэдуры вам давядзецца даказаць, што пагроза пераследу асабістая (гэта значыць, што звязана менавіта з вашай асабістай жыццёвай сітуацыяй, а не толькі з агульнай сітуацыяй ў краіне), мае падставу і тычыцца як мінімум адной з вышэйзгаданых прычын.

**а) Што значыць «асабістая пагроза»?**

Падчас трывання працэдуры вы павінны даказаць, што вы падвяргаліся пераследу ў краіне паходжання па меншай меры па адной з указаных прычын альбо што існуе рызыка таго, што ў сувязі з актуальнай сітуацыяй у Беларусі ў будучыні вы падвергнецеся такому пераследу.

**б) Як я магу даказаць, што мне пагражае пераслед у Беларусі?**

Памятаеце, што ўжо на мяжы пры запаўненні супрацоўнікам памежнай службы вашай анкеты на атрыманне міжнароднай аховы, трэба максімальна падрабязна апісаць пераслед, які вы перажылі, / або пагрозу такім праследам у выпадку вяртання ў Беларусь. Можна апісаць толькі самыя важныя моманты і зазначыць, што раскажаце пра дэталі падчас статуснага сумоўя.

Потым праз некалькі тыдняў ці месяцаў пасля ўезду ў Польшчу супрацоўнік Упраўлення па справах замежнікаў правядзе з вамі сумоўе, каб высветліць прычыны, якія прымусілі вас з'ехаць з Беларусі. Падчас сумоўя (статуснага сумоўя) вы павінны максімальна падрабязна апісаць пераслед, які вы перажылі. Калі вашы паказанні будуць вычарпальнымі, паслядоўнымі і будуць супадаць з агульнадаступнай інфармацыяй пра сітуацыю ў Беларусі – гэта будзе верагодным.

Калі, падаючы заяўку на міжнародную ахову ў Памежную службу, вы заявілі, што падвяргаліся гвалту, Упраўленне па справах замежнікаў павінна забяспечыць прысутнасць псіхолага падчас сумоўя і даць вам магчымасць сустрэцца з псіхолагам перад статусным сумоўем.

Вы таксама можаце падаць у Упраўленне па справах замежнікаў дакументы, калі ў вас ёсць, якія пацвярджаюць вашыя словы. Напрыклад, вы можаце далучыць пасведчанне членства ў адной з апазіцыйных палітычных партый, прысуд за ўдзел у дэманстрацыях супраць дзеючай улады, фатаграфіі, якія пацвярджаюць ваш удзел у дэманстрацыях і г.д.

Памятаеце, што заўсёды трэба прадстаўляць толькі праўдзівую інфармацыю і дакументы. Калі вы ў чымсьці не ўпэўненыя, напрыклад, не памятаеце дакладнай даты арышту альбо абапіраецеся на інфармацыю, атрыманую ад іншых людзей – выразна пазначце гэта ў пратаколе сумоўя.

Перад статусным сумоўем вы можаце пракансультавацца з юрыстам адной з няўрадавых арганізацый, якія бясплатна прадастаўляюць дапамогу бежанцам у Польшчы (гл. спіс у канцы).

**в) Што рабіць, калі я баюся вярнуцца ў Беларусь па іншай прычыне альбо я не ў стане даказаць асабістай пагрозы пераследу?**

Калі вы баіцеся вярнуцца ў Беларусь не праз пагрозу пераследу з-за расавай, рэлігійнай, нацыянальнай прыналежнасці, палітычных перакананняўі альбо прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, альбо вы не ў стане даказаць асабістую пагрозу пераследу, польскія ўлады выдадуць рашэнне аб адмове ў прадастаўленні вам статусу бежанца.

Калі на падставе сабраных па справе доказаў будзе прызнана, што ў Беларусі існуе для вас паважная пагроза:

- 1. смяротны прысуд ці смяротнае пакаранне,
- 2. катаванні або жорстае, бесчалавечнае ці прыніжаючае абыходжанне, пакаранне,
- 3. сур'ёзная і асабістая пагроза жыццю і здароўю, якая вынікае з шырокага выкарыстання гвалту супраць грамадзянскага насельніцтва ў сітуацыі міжнароднага або ўнутранага ўзброенага канфлікту польскія ўлады могуць даць вам **дадатковую ахову**

(гэта разам са статуса бежанца, другая форма міжнароднай абароны, якая дае вам вельмі падобныя правы ў Польшчы, як і  статус бежанца). Памятаеце, што дадатковая ахова прадастаўляецца тым самым рашэннем, паводле якога вам адмаўляюць ў статусе бежанца. Гэта азначае, што няма асобнай працэдуры для атрымання дадатковай аховы.

**г) Колькі часу зойме ўся працэдура?**

Рашэнне аб атрыманні міжнароднай абароны павінна быць вынесена на працягу 6 месяцаў з даты падачы заявы, а ў асаблівых выпадках гэты тэрмін можа быць падоўжаны да 15 месяцаў. Разгляданне заявы ў прыспешаным рэжыме аб аказанні міжнароднаў аховы адбываецца 30 дзён. Аднак на практыцы гэтая працэдура часта зацягваецца.

**д) Ці буду я мець месца жыхарства пасля падачы заявы аб міжнароднай ахове?**

Так, пасля падачы заявы аб міжнароднай ахове вы можаце пражываць у адным з некалькіх цэнтраў для замежнікаў, якія хадайнічаюць аб міжнароднай ахове.

Памятайце, калі ў заяве аб міжнароднай ахове не ўказаны адрас, па якім вы збіраецеся знаходзіцца, і вы ў гэты час не знаходзіцеся ў ахоўным цэнтры альбо цэнтры для замежнікаў, вы абавязаны з'явіцца на працягу 2 дзён з даты падачы заявы аб абароне ў прыёмны міграцыйны цэнтр для тых, хто хадайнічае аб міжнароднай ахове. У адваротным выпадку кіраўнік Упраўлення па справах замежнікаў вынесе рашэнне аб спыненні вашай працэдуры атрымання міжнароднай аховы.

Да Упраўлення па справах замежнікаў належаць ёсць два прыёмныя міграцыйныя цэнтры:

**Прыёмны міграцыйны цэнтр у Дэмбаку**
**Podkowa Leśna – Dębak**
**05-805 Otrębusy**

**Прыёмны міграцыйны цэнтр у Белай Падлясцы**
**ul. Dokudowska 19**
**21-500 Biała Podlaska**

**УВАГА!** На дадзены момант (на 4 верасня 2020 г.) на практыцы толькі цэнтр у Бялай Падлясцы функцыянуе як прыёмны цэнтр, таму незалежна ад таго, куды вы звярталіся за міжнароднай абаронай, вы павінны трапіць ў міграцыйны цэнтр у Белай Падлясцы на працягу 2 дзён. Гэта адкрыты цэнтр, можна выходзіць, калі хочаце. Аднак вы не можаце пакінуць яго на больш за 2 дні без дамовы  з супрацоўнікамі цэнтра, інакш вы будзеце выдалены са спісу людзей, якія маюць права на сацыяльную дапамогу, а разгляд вашай заявы на бежанства будзе спынены.

З прыёмнага цэнтра на працягу некалькіх дзён/ тыдняў вас адпраўляць ў адзін з некалькіх адкрытых цэнтраў пражывання для мігрантаў, якім заведуе кіраўнік Упраўлення па справах замежнікаў.

**е) Ці маю я права працаваць пасля падачы заявы на атрыманне статусу бежанца?**

Не, вы не маеце права працаваць на працягу першых 6 месяцаў працэдуры атрымання міжнароднай аховы. Калі на працягу 6 месяцаў не выносілі рашэння па вашай справе і няма ў гэтым вашай віны, вы маеце права атрымаць пасведчанне, якое дазваляе вам працаваць у Польшчы падчас працэдуры атрымання міжнароднай аховы.

**ё) Ці магчыма мне фінансавая дапамога?**

Вы маеце права на сацыяльную дапамогу ад Упраўлення па справах замежнікаў адразу пасля падачы заявы аб міжнароднай абароне і яна працягваецца да канца трывання працэдуры, нават калі тым часам атрымаеце права на працу ў Польшчы.

На працягу двух дзён пасля падачы заявы трэба падаць заяву на рэгістрацыю ў прыёмны цэнтр у Белай Падлясцы, якім кіруе Дэпартамент сацыяльнай дапамогі Упраўлення па справах замежнікаў. Праз некалькі дзён / тыдняў вас перавядуць у адзін з некалькіх цэнтраў пражывання, размешчаных у Польшчы.

Сацыяльная дапамога ўключае права на фінансавую падтрымку (сума ўстаноўлена заканадаўствам і няма магчымасці гэта змяніць, нават калі ў вас  выключная сітуацыя), права на бясплатную медыцынскую дапамогу (у цяперашні час прадастаўляецца фірмай Петра Медыка (Petra Medica Sp. z o.o.) – на месцы ў кожным міграцыйным цэнтры і ў іншых медыцынскіх установах, з якімі супрацуе Петра Медыка), права на атрыманне навучальных дапаможнікаў для дзяцей, якія вучацца ў польскай школе ці ходзяць у дзіцячы садок.

Калі вы знаходзіцеся ў цэнтры для замежнікаў, якія хадайствалі аб міжнарожнай ахове, вы не атрымліваеце фінансавай дапамогі, а толькі кішэнныя грошы ў памеры 70 злотых у месяц на дарослага чалавека альбо харчовы эквівалент у памеры 340 злотых у месяц на дзяцей, якія вучацца. Гэта звязана з тым, што цэнтр, дзе вы жывяце, забяспечвае вас ежай.

У асаблівых абгрунтаваных выпадках можна атрымаць г.зв «фінансаванне на жыццё па-за цэнтрам» – фінансавыя сродкі на арэнду кватэры і самастойнае пражыванне па-за міграцыйным цэнтрам. Даведайцеся ў супрацоўніка цэнтра, дзе вы жывяце, як падаць заяўку.

**УВАГА!** Грошаў на жыццё за межамі цэнтра прызначаецца вельмі мала і вы не атрымаеце падтрымкі ад Упраўлення па справах замежнікаў у пошуку кватэры. Вы павінны знайсці і арэндаваць яе самастойна на вольным рынку. Ёсць таксама няўрадавыя арганізацыі, якія дапамагаюць у пошуку жылля (гл. табліцу ніжэй).

**Больш інфармацыі выды і наконот сацыяльнай дапамогі па спасылцы:**
www.udsc.gov.pl/uchodzcy-2/pomoc-socjalna/system-pomocy-socjalnej/

Інфармацыю пра **медыцынскую дапамогу** можна атрымаць на інфалініі кампаніі Petra Medica: 22 112 02 06.

Падчас працэдуры атрымання міжнароднай аховы вы маеце права на сацыяльную дапамогу толькі ад Упраўлення па справах замежнікаў. Вы не маеце права на іншыя формы дапамогі ці льготы, на якія маюць права грамадзяне Польшчы. Гэтыя правы будуць вам прыслугоўваць толькі пасля  атрымання статуса бежанца ці дадатковай аховы.

**ж) Ці магу я вярнуцца ў Беларусь, калі зменіцца мая жыццёвая сітуацыя?**

Так. Памятайце, аднак, што калі вы падаеце заяву на атрыманне міжнароднай аховы ў Польшчы, вы абавязаны здаць пашпарт кіраўніку Упраўлення па справах замежнікаў. Гэта азначае, што калі вы вырашыце вярнуцца ў Беларусь падчас чакання на рашэння ці будзе вам прадстаўлена міжнародная ахова, то перад тым, як атрымаеце свой пашпарт, вам і так давядзецца чакаць рашэння, якім бы яно не было, альбо рашэння аб спыненні (па вашым запыце альбо паводле устаноўленага парадку) разгляду справы. Калі вы вернецеся ў краіну паходжання пасля атрымання вамі статусу бежанца/ аховы ў Польшчы, польскае Ўпраўленне па справах замежнікаў распачне працэдуру паводле устаноўленага

парадку, каб пазбавіць вас такой аховы (мяркуючы, што паколькі вы добраахвотна выехалі ў краіну паходжання, то вам больш не патрэбна абарона ад уладаў).

**Што варта ведаць, перш чым я прыеду на беларуска-польскую мяжу?**

У вас павінен быць пашпарт альбо іншы дакумент, які пацвярджае вашую асобу.

Памятаеце, што калі вы заявілі пра сваё жаданне падаць заяву аб атрыманні міжнароднай аховы, Памежная служба не можа адмовіць вам ўезд на тэрыторыю Рэспублікі Польшча толькі на той падставе, што ў вас няма дакумента, які дазваляе вам уехаць, напрыклад, візы альбо дакумента, які пацвярджае вашую асобу. Аднак у сітуацыі, калі ў вас няма дакументаў, якія пацвярджаюць вашу асобу, і вы ніколі не здавалі адбіткі пальцаў у польскай дыпламатычнай ці іншых польскіх установах, ёсць рызыка, што вас змесцяць у закрыты міграцыйны цэнтр да пацвярджэння вашай асобы.

Не прад'яўляйце падробленыя дакументы, не ўтойвайце важныя абставіны.

Калі вы былі збітыя альбо падвяргаліся псіхічнаму або фізічнаму гвалту, уключаючы сексуальны, вы павінны паведаміць пра гэта Памежнай службе. Гэта зробіць вашу гісторыю пераследу ў краіне вашага паходжання больш верагоднай, а разбіральніцтва будзе весціся ў адпаведнасці з патрэбамі ўразлівых людзей – гэта значыць, што падчас сумоўя зможа суправаджаць вас псіхолаг, і вы не зможаце быць змешчаныя ў закрыты міграцыйны цэнтр.

**Больш падрабязна пра закрытыя міграцыйныя цэнтры па спасылцы:** www.interwencjaprawna.pl/docs/ARE-211-monitoring-osrodki-strzezone.pdf

Не падпісвайце дакументы, якіх вы не разумееце альбо з якімі вы не згодныя.

Калі вы не валодаеце польскай мовай, то ва ўсіх афіцыйных дзеяннях, якія вас датычаць, павінен прымаць удзел перакладчык мовы, якую вы разумееце. Выключэнне: выпадкі, калі супрацоўнік службаў/ установы дастаткова валодае вашай мовай. Вы маеце права дамагацца змены перакладчыка, калі дрэнна яго разумееце (альбо зусім не разумееце).

Вы маеце права звярнуцца да любога юрыста ці адваката. Папрасіце скарыстацца тэлефонам каб звязацца з юрыстам альбо няўрадавым арганізацыям ці патэлефанаваць у офіс Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў – Прадстаўніцтва ў Варшаве альбо ў офіс Упаўнаважанага па правам чалавека.

**Арганізацыі і ўстановы, якія займаюцца дапамогай і падтрымкай людзей, што звяртаюцца за міжнароднай аховай**

| | |
|---|---|
| Вярхоўны камісар ААН па справах бежанцаў (Агенцтва ААН па справах бежанцаў) | ul. Przemysłowa 30<br>00-450 Warszawa<br>тэл. +48 22 628 6930<br>polwa@unhcr.org<br>www.unhcr.org/pl/ |
| Асацыяцыя юрыдычнай інтэрвенцыі (Stowarzyszenie Interwencji Prawnej) (юрыдычная дапамога, інтэгра-цыйная, дапамога перакладчыка) | ul. Siedmiogrodzka 5 lok. 51<br>01-204 Warszawa<br>тэл. +48 22 621 51 65<br>biuro@interwencjaprawna.pl<br>www.interwencjaprawna.pl |
| Фонд «Беларускі дом» (Fundacja Białoruski Dom) | ul. Wiejska 13 lok. 3<br>00-480 Warszawa<br>тэл. +48 226 227 701<br>+48 605 140 861<br>+48 883 200 856<br>dombelaruski@gmail.com<br>www.belaruskidom.eu/pl/kontakt/ |
| Цэнтр беларускай салідарнасці (Cenrtum Białoruskiej Solidarności) (інтэграцыйная, псіхалагічная, юрыдычная дапамога, у сферы адукацыі, дапамога пе-ракладчыка) | ul. Mazowiecka 12 lok. 23<br>00-033 Warszawa<br>тэл. +48 668 936 213<br>info.cbs@protonmail.com<br>kansulat.cbs@protonmail.com |
| Центр даследвання міграцыі пры Універсітэце Адама Міцкевіча ў Познані – Інфармацыйны пункт для мігрантаў | ul. Św. Marcin 78 lok. 421<br>61-809 Poznań<br>тэл. +48 503 979 758<br>office@migrant.poznan.pl<br>www.migrant.poznan.pl/pl/o-nas/ |
| Цэнтр юрыдычнай дапамогі імя Халіны Нэць (Centrum Pomocy Prawnej im.Haliny Nieć), Кракаў (юрыдычная дапамога) | ul. Krowoderska 11 lok. 7<br>31-141 Kraków<br>тэл. +48 12 633 72 23<br>biuro@pomocprawna.org<br>www.pomocprawna.org/kontakt |
| Фонд «Ла Страда» – фонд па барацьбе рабствам і гандлем людзьмі (Fundacja La Strada – Fundacja przeciwko Handlowi Ludźmi i Niewolnictwu) | Паштовая скрынка № 5<br>00–956 Warszawa 10<br>тэл. +48 22 628 99 99<br>strada@strada.org.pl<br>www.strada.org.pl/ |
| Фонд «Ацаленне» (Fundacja Ocalenie) (дапамога інтэграцыйная, псіхалагічная, з адукацыяй, з жыллём, дапамога перакладчыка, юрыдычная) | Krucza 6 lok. 14a<br>00-537 Warszawa<br>тэл. +48 22 828 04 50<br>biuro@ocalenie.org.pl<br><br>ul. Sadowa 8<br>18-400 Łomża<br>тэл. +48 86 214 16 57<br>lomza@ocalenie.org.pl<br>www.ocalenie.org.pl/kontakt |
| Хельсінкскі фонд правоў чалавека (Helsińska Fundacja Praw Człowieka) (юрыдычная дапамога) | ul. Zgoda 11<br>00-018 Warszawa<br>тэл. +48 22 556 44 40<br>hfhr@hfhrpol.waw.pl<br>www.hfhr.pl/kontakt/ |
| Фонд «Інстутут прававой дзяржавы» (Fundacja Instytut na rzecz Państwa Prawa), Люблін (юрыдычная дапамога) | ul. Chopina 14 lok. 70<br>20-023 Lublin<br>тэл. +48 81 743 68 00<br>www.panstwoprawa.org/ |

| | |
|---|---|
| Міжнародная арганізацыя па міграцыі (МАМ) (Międzynarodowa Organizacja ds. Migracji (IOM)) (дапамога ў дабравольным вяртанні) | ul. Wiejska 12<br>00-490 Warszawa<br>тэл. +48 22 62 38 154<br>iomwarsaw@iom.int<br>Інфармацыя для мігрантаў: +48 22 490 20 44<br>www.poland.iom.int/ |
| Фонд «Мульціацаленне» (Multiocalenie) | ul. Wilcza 35/41 lok. 29<br>00-678 Warszawa<br>тэл.+48 22 635 08 98<br>info@multiocalenie.org.pl<br>www.multiocalenie.org.pl |
| Фонд «Польскі міграцыйны форум» (Fundacja Polskie Forum Migracyjne (PFM)) (псіхалагічная, інтэграцыйная, юрыдычная дапамога, інфармацыйны пункт) | ul. Szpitalna 5 lok. 14<br>00-031 Warszawa<br>тэл. +48 22 110 00 85<br>info@forummigracyjne.org<br>www.forummigracyjne.org |
| Фонд «Польская гасціннасць» («Хлебам Соллю») (Fundacja Polska Gościnność (Chlebem i Solą)) (дапамога ў пошуку кватэры, адукацыйная праца з дзецьмі) | Warszawa<br>Кантакт з фондам праз фэйсбук: www.facebook.com/polacydla-uchodzcow/<br>kontakt@polskagoscinnosc.org |
| Таварыства інтэграцыі і полікультурнага грамадства «Намад» (NOMADA Stowarzyszenie na rzecz Integracji i Społeczeństwa Wielokulturowego), Вроцлаў (інфармацыя, юрыдычная дапамога) | ul. Paulińska 4/8<br>50-247 Wrocław<br>тэл. 71 307 03 35<br>nomada@nomada.info.pl<br>Парады:<br>counselling@nomada.info.pl<br>тэл. 791 576 459<br>www.nomada.info.pl |

| | |
|---|---|
| Таварыства «Гома Фабэр» (Stowarzyszenie Homo Faber), Люблін (рознабаковая падтрымка мігрантаў) | Офіс: Вышэйшая школа прадпрымальніцтва і адміністрацыі ў Любліне (Wyższa Szkoła Przedsiębiorczości i Administracji w Lublinie) (мапа)<br>ul. Bursaki 12<br>20-150 Lublin<br>pok. 108 (каля дзеканату, 2 паверх) тэл. 602 430 868<br>Час працы офіса: Серада, чацьвер, пятніца: 9:00 – 15:00)<br>info@hf.org.pl<br>www.hf.org.pl |
| Цэнтр падтрымкі імігрантаў і імігрантаў (Centrum Wsparcia Imigrantów i Imigrantek), Гданьск (рознабаковая падтрымка мігрантаў) | ul. Gdyńskich Kosynierów 11 lok. 1<br>80-866 Gdańsk<br>тэл. 512 949 109<br>centrum@cwii.org.pl<br>Панядзелак 12.00 – 20.00<br>Аўторак, серада, чацьвер 12.00 – 18.00<br>Другая субота месяца 10.00 – 16.00<br>www.cwii.org.pl/ |
| Упаўнаважаны Па Правах Дзіцяці | ul. Przemysłowa 30/32<br>00-450 Warszawa<br>тэл. +48 22 583 66 00<br>rpd@brpd.gov.pl<br>www.brpd.gov.pl/ |
| Упаўнаважаны Па Правах Чалавека | ul. Aleja Solidarności 77<br>00-090 Warszawa<br>тэл. +48 22 55 17 700<br>biurorzecznika@brpo.gov.pl<br>www.rpo.gov.pl/ |

графічны дызайн: Izabela Łęska



Stowarzyszenie
Interwencji
Prawnej

Stowarzyszenie Interwencji Prawnej
Siedmiogrodzka 5/51
01-204 Warszawa

biuro@interwencjaprawna.pl
(+48) 22 621 51 65

www.interwencjaprawna.pl | FB Stowarzyszenie Interwencji Prawnej